CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

WYPEŁNIA ZDAJĄCY

KOD

PESEL

***Miejsce na naklejkę.***
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **E-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# EGZAMIN MATURALNY
# JĘZYK BIAŁORUSKI – POZIOM ROZSZERZONY

## TEST DIAGNOSTYCZNY

TERMIN: **marzec 2021 r.**
CZAS PRACY: **180 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY

Uprawnienia zdającego do:
☐ dostosowania zasad oceniania.

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 9 stron.
   Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Możesz korzystać ze słowników językowych.

EMBB-R0-**100**-2103

Układ graficzny
© CKE 2021

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. На аснове дадзенага тэксту прадстаў праблему і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісам і думкамі аўтара і звярніся да іншых тэкстаў культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Ціхан Чарнякевіч
***„Будзьце як Дылан”. Іншы погляд***

Мабыць, не памылюся, калі скажу, што кожны раз шведскія акадэмікі досыць доўга спрачаюцца наконт новага лаўрэата ў галіне літаратуры.

Прыняцце канчатковага рашэння вымагае кансэнсусу, а кансэнсус – дастаткова моцнай аргументацыі.

Узнаўленню гэтае аргументацыі прысвяцілі свой час ці мала аналітыкаў па ўсім свеце, бо і рашэнне Нобелеўскага камітэта было даволі экстравагантным. Сяргей Дубавец у артыкуле “Нобель вярнуў сабе рэпутацыю” гаворыць пра адвагу і нечаканасць як найпершыя чыннікі развіцця – ад маналітнага і непарушнага канструкта *літаратура* (у выглядзе Шведскай Акадэміі) спрабуе вылузнуцца[1] ў нешта больш сучаснае.

„Мультыінструменталізм Нобеля, Алексіевіч, Дылана, Гедройца, Шчура – гэта ўсё з’явы адраджэння культуры, яго найпершая прыкмета. Аднажанравыя[2] творцы – наадварот, прыкмета стагнацыі” – піша Сяргей Дубавец. Мне ж падаецца, што якраз прывязкай да аднажанравай літаратуры і былі заклапочаныя акадэмікі.

Перадусім маю на ўвазе суадносіны паэзіі і песні […].

Шторaз Нобелеўскі камітэт сваім рашэннем робіць нейкі жэст, які мусіць быць значным для паняцця „сусветнай літаратуры” […]. Паводле запавету Нобеля, дасягненне абавязанае быць важным для чалавецтва ў цэлым. То бок, рашэнне павінна паказваць на пэўны факт у развіцці сусветнае літаратуры, увасабленнем якога і з’яўляецца лаўрэат.

У выпадку Боба Дылана, як мне падаецца, аргументацыю шведскіх акадэмікаў больш перадае думка пра тое, што функцыя паэзіі ў сучасным свеце цалкам змянілася. Бытаванне паэзіі цяпер супярэчыць паняццю „сусветнай літаратуры”. І таму – функцыя паэзіі дэлегаваная песні.

Гэта зусім не кажа пра заняпад і апакаліпсіс. Песня ў дадзеным выпадку з’яўляецца адмысловай лядоўняй, крыягеннай камерай, якая перахоўвае паэзію да лепшых часоў. Філолагі, якім чыталі ва ўніверсітэце гістарычную паэтыку, памятаюць вучэнне Аляксандра Весялоўскага, ягоную тэорыю паходжання паэзіі. У цэнтры тэорыі знаходзіцца першапачатковы сінкрэтызм, калі ўсе літаратурныя жанры выводзяцца з песні і меладэкламацыі з жэстамі.

Рэвeранс у бок песні, зроблены Нобелеўскім камітэтам, такім чынам трапляе ў сугучча з агульнай хадою літаратуры. Акадэмікі адзначаюць наяўны стан спраў з паэзіяй, якая можа стацца сусветнаю з’явай толькі дзякуючы песні. Разам з тым, і час разлому грамадскай свядомасці абраны вельмі нават слушны – эстэтычная рэвалюцыя 1960-х, квінтэсэнцыяй якіх з’яўляецца Дылан, пад чые тэксты падладжваліся і Ленан з Хендрыкс, […] і яшчэ богведама колькі выканаўцаў. Гэта ж і сігнал літаратурнай экспертнай рады да саміх музыкаў, наколькі важнае і адказнае прызначэнне іх працы.

[1] Вылузнуцца – перайсці, праявіцца.
[2] Аднажанравы творца – той, які выступае толькі ў адным жанры.

Менавіта яны ў сучасным свеце з'яўляюцца праваднікамі новага паэтычнага канону, а ў той жа час найбольшая ўвага закладаецца ў выбудоўванне гучання.

Акадэмія нібыта кажа: „Дзетухны, вы разумееце, што вашы творы слухаюць і чытаюць мільярды людзей? Калі ласка, расстаўляйце словы ў сваіх песнях як мага больш акуратна. Дылан харошы. Будзьце як Дылан".

Паводле Ц. Чарнякевіча, *„Будзьце як Дылан". Іншы погляд*, www.svaboda.org

**Тэма 2. Зрабі параўнаўчы аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Яўгенія Янішчыц
***Ты пакліч мяне. Пазаві...***

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

Я. Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві…* [у:] Яўгенія Янішчыц, *Пачынаецца ўсё з любві*, Мінск 2008, с. 18.

Янка Купала
***Явар і Каліна***

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай:
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым.

Захадам модлы пакорныя
З маткай-зямлёй адпраўляюць;
Тайна у ночаньку чорную

Месяца, зор выглядаюць.

Слухаюць смехаў русалчыных,
Лопату крылляў начніцы,
Ветру павеваў ап'янчаных,
Плюскату шклістай крыніцы.

Чуецца музыка дзіўная
Ў повесцях сонных імшараў...
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

Я. Купала, *Явар і Каліна*, knihi.com

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

.................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

..............................................................................................................................................................

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

<table>
<tr><th></th><th></th><th>Liczba punktów</th><th>Suma</th><th>Uzasadnienie przyznania 0 punktów</th></tr>
<tr><td rowspan="2">wypowiedź argumentacyjna</td><td>A.</td><td>0 – 3 – 6 – 9</td><td rowspan="2"></td><td></td></tr>
<tr><td>B.</td><td>0 – 3 – 6 – 9</td><td></td></tr>
<tr><td rowspan="2">interpretacja porównawcza</td><td>A.</td><td>0 – 2 – 4 – 6</td><td rowspan="2"></td><td></td></tr>
<tr><td>B.</td><td>0 – 4 – 8 – 12</td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>C.</td><td>0 – 2</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>D.</td><td>0 – 3 – 6</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>E.</td><td>0 – 1 – 2</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>F.</td><td>0 – 2 – 4</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>G.</td><td>0 – 2 – 4</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td></td><td>H.</td><td>0 – 2 – 4</td><td></td><td></td></tr>
</table>

# BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*